УДК 94:327(470)"18":929*І. Паскевіч

**М. М. Мязга**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# ВАЕННА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І. Ф. ПАСКЕВІЧА Ў КАНТЭКСЦЕ РАСІЙСКАЙ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ДРУГОЙ ЧВЭРЦІ XIX СТАГОДДЗЯ

*У артыкуле паказана, што ваенна-палітычная дзейнасць І. Ф. Паскевіча была непарыўна звязана з асноўнымі напрамкамі знешняй палітыкі Расіі другой чвэрці XIX ст. Адзін з іх – гэта расійская экспансія на Блізкім і Сярэднім Усходзе, што знайшло адлюстраванне ў войнах з Персіяй і Асманскай імперыяй. Другі – барацьба супраць ліберальных і нацыянальных рухаў у Еўропе, увасабленнем чаго стала падаўленне польскай і венгерскай равалюцый пры актыўным удзеле І. Ф. Паскевіча.*

Напалеонаўскія войны ў Еўропе завяршыліся фарміраваннем Венскай сістэмы міжнародных адносін. Расія з’яўлялася адным з асноўных стваральнікаў і абаронцаў названай сітэмы. Гэта ў многім прадвызначала расійскую знешнюю палітыку ў разглядаемы ў артыкуле перыяд. Яшчэ адна важная праблема міжнародных адносін таго часу – гэта ўсходняе пытанне, ад вырашэння якога залежаў лёс Асманскай імперыі, народаў Балкан і Блізкага Усходу.

З узыходжаннем на расійскі трон Мікалая І, на час каравання якога прыходзіцца найбольш актыўны перыяд дзяржаўнай дзейнасці Івана Фёдаравіча Паскевіча, у расійскай палітыцы на першы план выходзяць дзве задачы. Першая з іх звязана з захаваннем Венскай сістэмы, перш за ўсё такога яе элемента, як нязменнасць існаваўшых у еўрапейскіх краінах кансерватыўных дзяржаўна-палітычных сістэм, падаўленне ліберальных і нацыянальных рухаў. У гэтай справе Расіі належала вядучая роля. Мікалай І таксама лічыў неабходным і магчымым для Расіі ў той момант вырашыць на яе карысць усходняе пытанне, пашырыць яе ўладанні на Блізкім Усходзе. На дасягненне названых мэт расійскай знешняй палітыкі і была накіравана ваенна-палітычная дзейнасць І. Ф. Паскевіча.

З пачатку 1820-х гг. міжнародныя адносіны ў многім вызначаліся ўсходнім крызісам, які быў выкліканы нацыянальна-вызваленчым паўстаннем грэкаў супраць асманскага панавання. Калі Аляксандр І праводзіў дастаткова стрыманую палітыку ў дачыненні да Асманскай імперыі, то пры Мікалаю І курс стаў значна больш жорсткім, і справа відавочна набліжалася да чарговай руска-турэцкай вайны. Яе вынікам магло стаць ажыццяўленне імперскіх планаў Расіі на Балканах і Блізкім Усходзе. Такі ход падзей не задавальняў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

еўрапейскія дзяржавы, перш за ўсё Англію. Адным са сродкаў супрацьдзеяння планам Расіі лонданскі кабінет абраў правакаванне вайны паміж ёю і Персіяй. Расія з першай паловы XIX ст. у сваёй імперскай палітыцы на Каўказе перайшла да адкрытых тэрытарыяльных захопаў. Кантроль над Каўказам даваў магчымасць умацаваць уплыў Расіі ва ўсім рэгіёне Блізкага і Сярэдняга Усходу. Па сутнасці, палітыка Расіі ў адносінах да Каўказа, як справядліва адзначаюць аўтары выдання «История внешней политики России», насіла нацыянальна-каланіяльны характар [1, с. 215].

У 1826 г. уварваннем персідскай арміі ў расійскія ўладанні ў Закаўказзі пачалася руска-персідская вайна. На яе пачатку персідскія войскі мелі значную колькасную перавагу і наступалі. Гэта дало падставу Мікалаю I адхіліць ад камандавання Аляксея Пятровіча Ярмолава і прызначыць галоўнакамандуючым расійскімі войскамі на Каўказе І. Ф. Паскевіча. Перамога пад Елізаветаполем дала магчымасць адкінуць персідскія войскі ад расійскіх уладанняў.

Вясной 1827 г., выконваючы распараджэнне Мікалая I, І. Ф. Паскевіч павёў наступленне на Эрэвань. У чэрвені пачалася асада горада. Старыя сцены Эравані пачалі абвальвацца ўжо пасля першых залпаў рускай артылерыі, але гарнізон трымаўся ўпарта. Менавіта разбурэнне крэпаснай сцяны ў многіх месцах прымусіла персаў у канцы верасня перайсці да перамоў аб здачы крэпасці і капітуліраваць 1 кастрычніка 1827 г. Характэрна, што галоўная мячэць Эрэвані была адразу ператворана ў праваслаўную царкву [2, с. 220–221, 330, 332]. Падзенне Эрэвані карэнным чынам змяніла становішча на Каўказе. У сярэдзіне кастрычніка рускія войскі занялі Тэўрыз. Насельніцтва горада на чале з мусульманскім духавенствам вітала іх. Але затым узнікла незадавальненне ў сувязі з абкладаннем гараджан гандлёвымі подацямі [3, с. 12, 20, 77].

Пад час мірных перамоў І. Ф. Паскевіч бачыў сваю важнейшую задачу ў тым, каб змагацца з англійскім уплывам у Персіі. Заключаны ў 1828 г. па выніках вайны Туркманчайскі дагавор быў адным з шэрагу нераўнапраўных дагавораў, навязаных Персіі вялікімі дзяржавамі. Так, Расія атрымала манапольнае права мець ваенны флот на Каспійскім моры, вялікія ільготы ў гандлі з Персіяй, якая павінна была выплаціць і вялікую кантрыбуцыю. Расія пашырыла свае каланіяльныя ўладанні ў Закаўказзі, далучыўшы Эрэваньскае і Нахічываньскае ханствы [1, с. 225]. У выніку вайны ў многім дзякуючы намаганням І. Ф. Паскевіча Расія значна ўзмацніла свае пазіцыі на Сярэднім Усходзе.

Другая дзяржава, якая выступала праціўнікам пашырэння расійскага ўплыву на Каўказе – Асманская імперыя. Ва ўмовах усходняга крызісу таго часу справа дайшла да чарговай руска-турэцкай вайны. 14 красавіка 1828 г. Мікалай I падпісаў маніфест, які абвяшчаў вайну Асманскай імперыі. Сярод мэт вайны ў маніфесце гаварылася пра неабходнасць далучэння да Расіі чарнаморскага ўзбярэжжа Каўказа з гарадамі Анапа і Поці. Рускай арміяй на Каўказскім фронце павінен быў камандаваць І. Ф. Паскевіч. Шмат хто з рускіх афіцэраў мэту вайны бачыў у тым, каб вызваліць армянскі народ з пад улады Асманскай імперыі. Важнейшым дасягненнем І. Ф. Паскевіча ў першую ваенную кампанію стала ўзяцце Карса 5 ліпеня 1928 г. У кампанію 1829 г. рускімі войскамі быў узяты Эрзерум. У выніку атрыманых рускімі перамог турэцкая армія на Каўказскім фронце была практычна поўнасцю знішчана [4, с. 66, 77].

Поспехі рускай арміі на Азіяцкім тэатры ваенных дзеянняў спрыялі падпісанню выгаднага для Расіі Андрыянопальскага міру 1829 г. Згодна з ім на Каўказе Расія атрымала новыя тэрыторыі: чарнаморскае ўзбярэжжа ад вусця Кубані да Поці. Тым самым быў завершаны працэс далучэння да Расіі Закаўказзя. Расія атрымала права свабоднага гандлю на тэрыторыі Асманскай імперыі, якая павінна была выплаціць вялікую кантрыбуцыю, яўна перавышаючую яе плацёжаздольнасць [1, с. 237]. Фактычна пасля Андрыянопальскага міру Асманская імперыя трапіла ў залежнасць ад Расіі, для якой было выгадна мець слабога суседа. Узмацніліся імперскія пазіцыі Расіі на Блізкім і Сярэднім Усходзе. Узначальваўшы ў той час расійскае міністэрства замежных спраў Карл Васільевіч Нессельродэ адзначаў, што

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Асманская імперыя пасля Андрыянопальскага міру магла існаваць толькі пад пратэктаратам Расіі і павінна была падначальвацца толькі яе жаданням [5, с. 253].

Пасля заканчэння вайны з Асманскай імперыяй намаганні І. Ф. Паскевіча былі накіраваны на пакарэнне горных народаў Паўночнага Каўказа, супраць якіх ён правёў ваенную кампанію 1830 г. Каб трывала інтэграваць каўказскія землі ў склад Расіі, ён у красавіку 1830 г. звярнуўся да цара з прапановай увесці тут расійскі вобраз праўлення і расійскія законы [2, с. 351].

Пасля завершэння вайны з Асманскай імперыяй ваенна-палітычная дзейнасць І. Ф. Паскевіча была звязана з барацьбой царызма з нацыянальнымі і ліберальнымі рухамі ў Еўропе. 17 (29) лістапада пачалося нацыянальна-вызваленчае паўстанне ў Царстве Польскім, дзе Мікалай І быў канстытуцыйным манархам. Да канца 1830 г. уся тэрыторыя Царства была вызвалена ад рускага войска. У студзені польскі сейм прыняў рашэнне аб зняржэнні Мікалая І з польскага прастола. Рускую армію, якой было даручана падаўленне польскага паўстання, пасля смерці І. І. Дібіча летам 1831 г. узначаліў І. Ф. Паскевіч. Маючы вялікую перавагу ў сілах (у бітве за Варшаву руская армія налічвала 90 тыс., а польская – 35 тыс.), ён змог у верасні 1831 г. падавіць польскае паўстанне. За гэта атрымаў ад цара тытул князя Варшаўскага.

Вынікам падаўлення паўстання стала ўзмацненне палітыкі русіфікацыі на землях былой Рэчы Паспалітай. Была адменена польская канстытуцыя 1815 г. Уведзены ў 1832 г. «Арганічны рэгламент» ліквідаваў элементы польскай дзяржаўнасці на тэрыторыі Царства Польскага: польскае войска, сейм. У тым жа годзе І. Ф. Паскевіч быў прызначаны намеснікам у Польшчы. На польскіх землях было ўведзена ваеннае становішча, якое ўжо не адмянялася да канца царавання Мікалая І. Устанаўлівалася дзяленне польскіх зямель на губерні па ўзору Расіі, уводзіліся расійскія грашовая сістэма, сістэма мер і вагаў, заканадаўства, была пабудавана Варшаўская цытадэль [6, с. 129].

1848 г. прынёс у Еўропу новую хвалю рэвалюцый. Сярод найбольш значных рэвалюцыйных выступленняў была венгерская нацыянальная рэвалюцыя. Венгры 14 красавіка 1849 г. абвясцілі сваю незалежнасць ад Габсбургаў. Расія, верная сваёй палітыцы барацьбы з нацыянальным рухам у Еўропе, выказала гатоўнасць прыйсці на дапамогу аўстрыйскаму імператару Францу Іосіфу І. Цар Мікалай І так тлумачыў неабходнасць інтэрвенцыі ў Венгрыю: «Не ўмяшаўся б, калі б свая рубашка не была б бліжэй да цела, гэта значыць, калі б не бачыў у Бэме і іншых машэніках у Венгрыі не адных ворагаў Аўстрыі, але ворагаў сусветнага парадку і спакою... якіх знішчаць трэба для нашага ж спакою» [1, с. 357]. Базай для падаўлення венгерскай рэвалюцыі стала тэрыторыя Царства Польскага, намеснікам у якім з'яўляўся І. Ф. Паскевіч. Яму цар даручыў камандаванне рускімі войскамі, перад якімі была пастаўлена задача падавіць венгерскую рэвалюцыю. У чэрвені 1849 г. пачалася расійская інтэрвенцыя ў Венгрыю. Умяшанне Расіі адыграла галоўную ролю ў разгроме венгерскай рэвалюцыі і выратаванні імперыі Габсбургаў, якая з'яўлялася перашкодай для многіх народаў у справе стварэння нацыянальных дзяржаў. Падавіўшы венгерскую рэвалюцыю, расійскі ўрад канчаткова замацаваў за сабой статус жандарма Еўропы.

Крымская вайна вярнула І. Ф. Паскевіча да спраў, звязаных з блізка-ўсходнім напрамкам расійскай палітыкі. Ён быў прызначны галоўнакамандуючым рускай арміяй на паўднёвых і заходніх граніцах і 3 красавіка 1854 г. прыбыў у Дунайскую армію. Але летам па стану здароўя І. Ф. Паскевіч пакінуў армію. У канцы 1854 г. ён прыбыў на тэатр ваенных дзеянняў у Крым, але хутка зноў адбыў з арміі з–за праблем са здароўем. У выніку ў Крымскай вайне, якая была звязана з каланіяльнымі планамі царызма на Блізкім Усходзе, І. Ф. Паскевіч ужо не адыграў прыкметнай ролі.

Такім чынам, ваенна-палітычная дзейнасць І. Ф. Паскевіча ў час царавання Мікалая І была накіравана на рэалізацыю важнейшых напрамкаў расійскай знешняй палітыкі таго гістарычнага моманту. У час сваёй службы на Каўказе ён ажыццяўляў камандаванне рускай арміяй у войнах з Персіяй і Асманскай імперыяй. Па сваёй сутнасці з боку Расіі гэта былі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

каланіяльныя войны. Іх вынікам сталі новыя тэрытарыяльныя захопы Расіі на Каўказе і навязванне Персіі і Асманскай імперыі нераўнапраўных дагавораў, якія ставілі іх у залежнасць ад Расіі. У 1830-я – 1840-я гг. І. Ф. Паскевіч выступаў у ролі актыўнага праваднiка палітыкі Мікалая І, якая была накіравана на падаўленне нацынальнага і ліберальнага рухаў у Еўропе. Дадзеная палітыка пазбаўляла шэраг народаў магчымасці стварыць свае назалежныя нацыянальныя дзяржавы і перайсці да канстытуцыйнай больш дэмакратычнай формы дзяржаўнага кіравання. Уклад І. Ф. Паскевіча ў названы палітычны курс праявіўся ў яго актыўным удзеле у падаўленні польскага 1830–1831 гг. і венгерскага 1848–1849 гг. паўстанняў.

### Крыніцы і літаратура


1. История внешней политики России. Первая половина XIX века (От войн России против Наполеона до Парижского мира 1956 г.). – М.: Международные отношения, 1999. – 448 с.
2. Бантыш–Каменский, Дм. Биографии российских генералиссимусов и генерал- фельдмаршалов: в 4 ч. Ч. 3–4. Репринтное издание 1840 г. / Дм. Бантыш-Каменский. – М.:
«Культура»,1990. – 382 с.
3. Щербатов, А. П. Генерал-фельдмаршал князь Паскевич: Его жизнь и деятельность: в 7 т. Т. 3 / А. П. Щербатов [электронны рэсурс]. – СПб.: Типография Р. Голике, 1891. – 542 с. – Режим доступа: https://dlib.rsl.ru/viewer/01003918726#?page=20 – Дата доступа: 24.04.2019.
4. Валентини. Обзор главнейших действий генерал-фельдмаршала князя Варшавского графа Паскевича-Эреваньского проив турок в Азии / Валентини [электронны рэсурс]. – Санкт-Петербург: типография Николая Греча, 1836. – 87 с. – Режим доступа: https://www.prlib.ru/item/433433. – Дата доступа: 24. 04. 2019.
5. Дебидур, А. Дипломатическая история Европы : в 2 т. Т. 1 / А. Дебидур. – М.:
«Культура»,1990. – 509 с.
6. Нарысы гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа. X–XXI ст.ст. – Варшава: Выдавецтва Demart Sp. Z. o. o., 2005. – 312 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ